Падтрымай "Вясну" на PATREON

Алену Луцковіч пакаралі штрафам у 15 базавых

21.02.2017 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед



Алена Луцковіч у судзе

У судзе Акцябрскага раёна (Гомельская вобласць) 17 лютага завяршыўся разгляд адміністрацыйнага пратакола, складзенага міліцыянерамі ў дачыненні да актывісткі Аб'яднанай грамадзянскай партыі **Алены Луцковіч.**

Месяц таму, 17 студзеня, яна разам з блогерам **Андрэем Павуком** праводзіла апытанне мясцовых жыхароў, што міліцыя расцаніла як дробнае хуліганства (артыкул 17.1 КоАП).

Па інфармацыі сайта АГП, Луцковіч, згодна з міліцэйскім пратаколам, "наўмысна, беспадстаўна, неаднаразова спыняла і прыставала да грамадзян, патрабавала адказаць на яе пытанні, на просьбы грамадзян адстаць не рэагавала, чым парушыла грамадскі парадак і спакой грамадзян".

Актывістка АГП і блогер здымалі сюжэт для супольнасці ў сацыяльнай сетцы "Рудабельская паказуха". Яны хацелі пачуць меркаванне мясцовых жыхароў пра выбары — наколькі яны сумленныя і справядлівыя.

Суддзя **Людміла Гормаш** 17 лютага вынесла рашэнне аб тым, што Луцковіч вінаватая ў дробным хуліганстве, бо "наўмысна, беспадстаўна, назойліва, неаднаразова спыняла і чаплялася да грамадзян, патрабавала адказаць на яе пытанні, на просьбы грамадзян пакінуць іх у спакоі не рэагавала". Лідар

"Маладых дэмакратаў" віну не прызнала і для абгрунтавання сваёй невінаватасці падала відэазапіс апытання. Відэа суд не прыняў да ўвагі, бо "запіс з перапынкамі, зафіксаваны ў дачыненні да кожнага грамадзяніна асобна, такім чынам, не з'яўляецца поўнай фіксацыяй".
Луцковіч пакараная штрафам у 15 базавых велічынь (345 рублёў).
17 студзеня ў міліцыю патэлефанаваў намеснік начальніка аддзела ідэалагічнай працы райвыканкама **Сяргей Зарычны**. Ён заўважыў на цэнтральнай плошчы Андрэя Павука і Алену Луцковіч, якія "рабілі нейкае апытанне грамадзян", і вырашыў, што яны парушаюць грамадскі парадак.
Міліцыя апытала трох работнікаў райвыканкама, да якіх быццам бы прыставала Луцковіч. Начальнік аддзела арганізацыйна-кадравай працы Таццяна Семянец, начальнік упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Таццяна Габінетава і галоўны спецыяліст аддзела архітэктуры і будаўніцтва Ірына Дулуб напісалі, што пасля "назойлівых чаплянняў" Луцковіч быў парушаны іх эмацыйны спакой, што паўплывала на ажыццяўленне працоўнай дзейнасці.
Габінетава паскардзілася ў міліцыю, што Луцковіч "рэзкім рухам" заступіла ёй "рух на працу ў будынак РВК" і стала "піхаць" ёй у твар мікрафон.
Актывістка расцэньвае дзеянні мясцовых міліцыі, чыноўнікаў і суда як пераслед паводле палітычных матываў.


> *"Абсурдная і смешная сітуацыя, з аднаго боку, і сумная — з іншага. Чыноўнікі ў нас як каста недатыкальных, да іх нельга падыходзіць, нельга задаваць пытанні. З іншага боку, у іх вельмі слабая псіхіка, раз пасля аднаго пытання аб выбарах яны страцілі эмацыйны спакой і не здолелі працаваць",* — пракаментавала рашэнне суда Луцковіч.

Яна лічыць, што спакой чыноўнікаў парушыла пытанне аб выбарах, бо многія работнікі райвыканкама засядаюць ва ўчастковых і акруговых камісіях і "каму, як не ім, ведаць пра фальсіфікацыі".
Актывістка АГП будзе абскарджваць рашэнне суда ў вышэйшай інстанцыі.

Твитнуть







Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы


Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА




Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі


"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў



ГАЛОЎНАЕ



Без зменаў. Адбылася апеляцыя па справе "Вясны"



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра

пераслед па "справе цюкоў"

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

СЯБРОЎСТВА

EENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

VOICE OF BELARUS

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY